Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (115), 2019

УДК 811.111'37

Гісторыка-этымалагічны аналіз слоў лексіка-семантычнага мікраполя «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове

Г.В. Петрасян

Артыкул прысвечаны лексічнай структураванасці і семантычнай напоўненасці мікраполя «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове. На матэрыяле тлумачальных, этымалагічных слоўнікаў і слоўнікаў сінонімаў праводзіцца аналіз асноўных і дадатковых сем мікраполя. Асаблівая ўвага надаецца гістарычным пераўтварэнням лексем мікраполя «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове.
Ключавыя словы: лексічная адзінка, сема, лексіка-семантычнае поле, лексіка-семантычная група, лексіка-семантычнае мікраполе, ядро мікраполя, цэнтр мікраполя, перыферыя мікраполя.

The article is devoted to the structure and semantic content of the microfield «beautiful appearance» in the English language. The analysis of core and additional semes is carried out using the data from explanatory, etymological and synonymic dictionaries. Particular attention is paid to the historic transformation of the lexical units from microfield «beautiful appearance» in the English language.
Keywords: lexical unit, seme, lexical-semantic field, lexical-semantic group, lexical-semantic microfield, core center of microfield, microfield peripherals.

Тэрмін «семантычнае поле» пачаў актыўна ўжывацца пасля таго, як выйшлі ў свет працы Й. Трыра і Г. Іпсэна. Палявое структураванне дазваляе раскрыць дыялектычныя сувязі паміж моўнымі з'явамі і пазамоўнай рэчаіснасцю, выявіць нацыянальна-спецыфічныя рысы моўнай свядомасці [1]. Лексіка-семантычнае поле (далей – ЛСП) – гэта сукупнасць слоў адной ці некалькіх часцін мовы на аснове агульнага сэнсавага кампанента (семы) у структуры іх значэння. Моўныя адзінкі складаюць іерархічна арганізаваную сукупнасць [2, с. 99].

Традыцыйна ў складзе ЛСП вылучаюць ядро, цэнтр (прыядзерную зону) і перыферыю. Ядро поля выражае агульнае значэнне – архісему. Цэнтр поля ўтвараюць словы з дыферэнцыйнымі семантычнымі прыметамі. Моўныя адзінкі, якія знаходзяцца на перыферыі, маюць складаны, спецыялізаваны змест і цесна ўзаемадзейнічаюць з членамі сумежных палёў. Пераход ад ядра да перыферыі не мае выразных межаў, адбываецца паступова. Семантычныя палі могуць перасякацца ці цалкам уваходзіць адно ў другое. Значэнне слова выразна вызначаецца толькі ў тым выпадку, калі вядомы значэнні іншых слоў з таго самага поля.

Аналіз лексічных адзінак паказаў, што ЛСП «прыгажосць» – гэта складаная сістэма, якая ўключае ў сябе некалькі падсістэм з лексемамі, аб'яднанымі інтэгральнай семай 'прагажосць'. У яго ўваходзіць чатыры субпалі: 1) «прыемная ці прывабная рыса чаго-небудзь», 2) «прыгожая асоба ці рэч», 3) «выключная якасць у сваім класе», 4) «перавага». Кожнае субполе складаецца з мікрапалёў, якія распадаюцца на групы. Напрыклад, субполю «прыемная ці прывабная рыса чаго-небудзь» належаць мікрапалі «прыгожы знешні выгляд» і «якасці, што даюць пачуццёвае ці інтэлектуальнае задавальненне».

Лексіка-семантычнае мікраполе «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове складаюць 116 лексічных адзінак розных часцін мовы. Гэтыя словы былі выяўлены метадам мэтавай выбаркі з такіх слоўнікаў, як «Oxford Advanced Learner's Dictionary of Current English» А.С. Хорнбі [3]; «The American Heritage Dictionary of the English Languages» Вільяма Морыса [4]; «Cambridge Advanced Learner's Dictionary» [5]; «Chambers' Dictionary» [6]; «Merriam-Webster Online: Dictionary and Thesaurus» [7]; «Webster's New World College Dictionary» [8].

Мікраполе «прыгожы знешні выгляд» складаецца з 10 груп:

1) «элегантнасць»: *refinement* (зграбнасць), *elegant* (элегантны), *grace* (грацыя);

2) «зачараванне»: *fascination* (зачараванне); *congeniality* (кангеніяльнасць);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) «прывабнасць»: *attractiveness* (прывабнасць), *catching* (спакуслівы), *clean* (ясны), *magnetic* (магнетычны);

4) «уражанне»: *impressive* (уражальны), *stark* (дасканалы);

5) «вытанчанасць»: *distinguished* (далікатны), *sophistication* (вытанчаны), *subtle* (пяшчотны);

6) «шарм»: *temptation* (спакуса), *charm* (шарм), *allure* (спакуса);

7) «сексуальнасць»: *fascination* (зачараванне), *sexiness* (сексуальнасць), *sex appeal* (сексуальнасць);

8) «асляпляльнасць»: *brilliant* (іскрысты), *radiant* (бліскучы), *bright* (яркі);

9) «асалода»: *delight* (прыемнасць), *enjoyment* (асалода), *pleasure* (задавальненне), *gratification* (радасць), *relish* (хараство);

10) «зладжанасць»: *regular* (правільны), *fine* (тонкі), *sharp* (выразны).

Гісторыка-этымалагічны аналіз блізкіх да ядра лексічных адзінак дазваляе вылучыць дадатковыя семы і прасачыць гістарычныя пераўтварэнні і асноўныя шляхі замацавання слоў са структуры мікраполя «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове.

Этымалагічныя слоўнікі згадваюць падабенства лексем заходнеўрапейскіх і славянскіх моў: старажытнаславянскі корань *крас-*, па адной з гіпотэз, мае агульнае паходжанне з лацінскім словам *gratia*, якое праз адну са сваіх формаў *gratus* збліжаецца з санскрыцкім *gurtas*, ад якога паходзіць слова *grateful*, што ў англійскай мове азначае ‘ўдзячны; любы, прыемны, які дастаўляе задавальненне’. Гэты корань узыходзіць да старажытных індаіранскіх і балтыйскіх слоў, што абазначаюць ‘усхваленне’ [9, с. 1313]. Ён уяўляе сабою выражэнне эмацыйнай ацэнкі ўхвалы і захаплення і мае цесную сувязь з катэгорыяй прыгажосці. У дадзеным выпадку паняцце «прыгажосць» этымалагічна развіваецца па лініі: пэўнае дзеянне са станоўчай ацэнкай – агульная станоўчая ацэнка – эстэтычная станоўчая ацэнка.

Аналізуючы ядро мікраполя «прыгожы знешні выгляд» і блізкія да яго лексічныя адзінкі ў англійскай лінгвакультуры, варта адзначыць, што словы *beauty* і *beautiful* этымалагічна з’яўляюцца запазычаннямі з французскай мовы, а калі закрануць яшчэ больш «даўні» этымалагічны пласт, то можна пераканацца, што карані французскага слова ўзыходзяць да лацінскага *bellus*, якое, у сваю чаргу, узыходзіць да слова *bonum* (добры) [9, с. 237–238].

Такім чынам, у англійскай мове ідэя прыгажосці ўяўляе сабою канкрэтызацыю агульнай ацэначнай станоўчай прыметы. Сэнсавае збліжэнне агульнай і эстэтычнай станоўчай ацэнкі з’яўляецца натуральнай ацэначнай кваліфікацыяй аб’ектаў паводле прынцыпу «добрае – прыгожае».

Слова *beauty* было ўпершыню згадана ў пісьмовых крыніцах XIV ст. (*bealte*) і спачатку азначала вонкавую, фізічную прывабнасць (*physical attractiveness, also goodness, courtesy*). Гэтая адзінка паходзіць ад англа-нармандскага *beute* і раней ад старафранцузскага (XII ст.) *biauté* (прыгажосць, спакуслівасць, прыгожы чалавек) і мае сучасны французскі варыянт *beauté*. У ранніх крыніцах можна сустрэць іншую форму – *beltet* ад народна-лацінскага *bellitatem* (*bellitas*) (стан прыгажосці), што паходзіць ад лацінскага *bellus* (сімпатычны, чароўны). Паводле слоўніка, у класічнай лацінскай мове гэтае слова ўжываецца ў адносінах да жанчын і дзяцей або ў іранічным кантэксце з утоеным сарказмам выступае абразай асобы мужчынскага полу [10, с. 237–238].

Гэтая адзінка напрыканцы XIV ст. замяніла сабой стараанглійскае слова *wlite*, якое мела значэнне ‘прывабная жанчына’.

У англійскай мове можна знайсці шмат фразеалагізмаў, крылатых выразаў, прыказак і прымавак са словам *beauty*, напрыклад, вядомы выраз *beauty sleep* (прыгожы сон) – ‘сон перад поўначчу’ (з’явіўся ў 1850 г.), а таксама *beauty spot* (прыгожая кропка) – ‘радзімка, радзімы знак’ (1650-я гг.). *Beauty parlor* (салон прыгажосці) датуецца 1894 г. Крыніцы 1866 г. зафіксавалі таксама лексему *beaut*, якая з’яўляецца скарачэннем ад *beauty* і абазначае прыгожую рэч ці чалавека [9, с. 237–238].

У этымалагічных слоўніках можна знайсці спецыфічнае сэнсавае адценне прыгажосці, сутнасць якога суадносіцца з наступным пастулатам: «прыгажосць можа быць фатальнай», «прыгажосць можа загубіць», «прыгажосць так ці інакш злучана з падкопамі д’ябла»,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«прыгажосць ёсць зло» і да т. п. Прыкладам, што пацвярджае гэты тэзіс, з'яўляецца выраз *Beauté du diable* (прыгажосць д'ябла), які часта ўжываецца ў брытанскай літаратуры XIX ст. менавіта ў французскім напісанні (хоць часам можна сустрэць і варыянт *devil's beauty*). Першае згадванне гэтай фразы адносяць да 1825 г. [9, с. 237].

Слова *bright* (яркі) знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці да ядра лексіка-семантычнага мікраполя. Лексема паходзіць ад стараанглійскага *bryht, beorht* (яркі, надзвычайны, чароўны). Паступова лексема набыла таксама сэнс 'разумны', 'дасціпны' (*quick-witted* з 1741 г. ужываецца ў літаратуры менавіта ў гэтым сэнсе).

Можна сустрэць таксама многа шэкспірызмаў, якія, хоць і не з'яўляюцца ўжывальнымі на сённяшні дзень, але праз этымалогію дапамагаюць скласці поўнае ўяўленне пра «прыгожы знешні выгляд». Слова *sheen* (зіхатлівы, яркі) упершыню ўжыта ў п'есе «Гамлет» у 1602 г. Этымалагічна слова эвалюцыявала ад протагерманскага *skauniz* (заўважны) [9, с. 3003].

Яшчэ адна адзінка, блізкая да ядзернага сегмента мікраполя «прыгожы знешні выгляд», *pretty* (добры, выдатны) узыходзіць да протагерманскага *pratt*. Этымалагічна яна паходзіць ад старажытнаанглійскага *prættig* (хітры); пазней – ад старажытнаісландскага *prettr* і нідэрландскага *prettig* [10, с. 289].

Варта адзначыць, што дыяхранічнае развіццё значэння гэтага слова праходзіла паралельна з развіццём семантыкі іншых слоў – *canny, clever, cunning, fine, nice*. *Pretty* можна суаднесці з коранем, які паходзіць ад літоўскага *protas* (розум). Такім чынам, у складзе мікраполя «прыгожы знешні выгляд» прысутнічае таксама і шэраг асобных станоўчых паняццяў-якасцей – 'разумны', 'умелы', якія першапачаткова перайшлі ў разрад агульнаацэначных, а потым з цягам часу і семантычным развіццём зноў канкрэтызаваліся для абазначэння прыгажосці. Гэты прыклад сведчыць пра існаванне тэндэнцый да развіцця значэння слова ад канкрэтнага да абстрактнага. Абазначэнне эмацыйных модуляў, такіх, як 'страх', 'радасць', 'смутак', таксама развівалася ад канкрэтнага да абстрактнага, ад выражэння чалавечай рэакцыі (напрыклад, страх выяўляецца праз здранцвенне, задуху) да абазначэння эмацыйнага псіхічнага стану.

Такім чынам, словы з эстэтычнай ацэнкай у складзе мікраполя «прыгожы знешні выгляд» развіваюцца па трохступеневай мадэлі: пэўная станоўчая прымета – агульная станоўчая прымета – эстэтычная станоўчая прымета.

У непасрэднай семантычнай блізкасці ад ядра вывучанага мікраполя знаходзіцца таксама адзінка *fair*. *Fair* (выдатны) мае германскія карані і паходзіць ад старажытнаанглійскага *fæger*. Гэты корань сустракаецца ў паўночных мовах (*fagr)*; старажытнасаксонскай (*fagar)*; старажытна-нямецкай (*fagar)*; мове готаў (*fagrs* – прыгодны, прыдатны); старажытнаісландскай (*faga* – упрыгожваць); а таксама мае сувязь з сучаснай нямецкай мовай (*fegen* – месці, чысціць); літоўскай (*puosti* – упрыгожваць) [10, с. 124]. Такім чынам, прыгажосць мае адценні семы 'ачышчэнне, упрыгожанне'.

Лексіка-семантычнае мікраполе «прыгожы знешні выгляд» у англійскай мове мае дадатковую сему 'здзіўленне'. Гэта значыць, ідэя эстэтычнай ацэнкі выяўляецца праз словы са значэннем 'дзівіцца'. Пацвярджае тэзіс лексема *stunner*, ужытая ўпершыню ў 1829 г. у значэнні 'прыгожая жанчына', а таксама 'той, хто выклікае захапленне ці здзіўленне' [9, с. 3279]. Англійскі дзеяслоў *admire* з'яўляецца запазычаннем з лацінскай мовы і ўзыходзіць да слова *miracle* (дзіва). Лацінскі корань *mirari* абазначае 'глядзець' [9, с. 2000–2001].

Такім чынам, прыгажосць – візуальнае паняцце, а таксама з'яўляецца шчаслівай «выпадковасцю», рэдкай камбінацыяй станоўчых характарыстык ('дзіва', 'дзівіцца').

У склад мікраполя «прыгожы знешні выгляд» таксама ўваходзяць лексемы *charm, charming* (зачараванне, чароўны). Як паказана ў этымалагічным слоўніку М. Макоўскага, *charm* азначае 'зачароўваць, заварожваць, злучаць чарамі' [10, с. 86]. Гэтае слова ўзыходзіць да французскага *charme*, якое, у сваю чаргу, суадносіцца з лацінскім *carmen* (песня) праз дысіміляцыю. Гэта прыводзіць нас да высновы, што прыгажосць непарыўна злучаецца з харызмай, зачараваннем і нясе, акрамя іншых асацыяцый, сувязь з вядзьмарствам, магіяй. Прыгажосць «зачароўвае» свайго гледача.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзеяслоў *beautify* выкарыстоўваецца ў англійскай мове з XV ст. і абазначае ‘рабіць што-небудзь прыгожым’, ‘рабіцца прыгожым’. Яшчэ адзін дзеяслоў, што ўваходзіць у мікраполе «прыгожы знешні выгляд», *embellish*, упершыню датаваны сярэдзінай XIV ст., абазначае ‘рабіць што-небудзь прыгожым’, ‘упрыгожваць’. Гэтае слова паходзіць ад старафранцузскага *embelliss, embellir* (упрыгожваць, асабліва арнаментам, узорам). У сярэдзіне XV ст. з’явілася таксама значэнне ‘прыбірацца’ і ‘надзяляць гісторыю, апавяданне выдуманымі дэталямі’ [9, с. 238].

Слова *gorgeous* (цудоўны, ухвальны, выдатны) датуецца XVI ст. Слоўнік сведчыць, што дадзеная лексема мае дачыненне да адзення і паходзіць ад сярэднефранцузскага *gorgias* (элегантны, модны) [9, с. 1307]. Паходжанне слова застаецца невядомым, але выказваюцца здагадкі, што лексема мае дачыненне да слова «карàлі» ад старафранцузскага *gorge* (горла). Гэта сведчыць, што паняцце прыгажосці непарыўна звязана з адзеннем, аксесуарамі. Яно значна шырэйшае, чым пазначэнне прыемнага выгляду, дадзенага ад прыроды.

Падчас гістарычных пераўтварэнняў не ўсе лексемы змаглі замацавацца ў сучаснай англійскай мове. Цікавым для аналізу з’яўляецца слова *acute*, якое на дадзены момант не ўваходзіць у ЛСП «прыгажосць» у англамоўнай культуры. Пад канец XIV ст. гэтае слова ўжывалася (як і сёння) у дачыненні да ліхаманак, хваравітых станаў і супрацьстаўлялася слову *chronic* (хранічны). Слова паходзіць ад лацінскага *acutus* (востраканцовы, востры), у лацінскай мове яно займела пераносны сэнс – ‘захапляльны, усёпаглынальны’, пазней – ‘цікавы, прыемны, прывабны’ (XV ст.). Значэнні ‘інтэнсіўны’, ‘які захапляе’ датуюцца 1727 г. Слоўнік таксама мае інфармацыю пра тое, што ўжо ў 1731 зафіксавана ўжыванне слова *cute* у значэнні *clever* (разумны) як скарачэнне ад *acute*; далей этымалагічнае развіццё адзінка атрымала ў 1834 г. і набыла гутарковае значэнне слова *pretty* [9, с. 28].

Гісторыка-этымалагічны аналіз мікраполя «прыгожы знешні выгляд» паказаў, што часта лексемы праходзілі некалькі моўных ступеняў і толькі потым знаходзілі патрэбнае значэнне ў англійскай мове. Можна вылучыць мовы, якія паслужылі грунтам для фармавання лексем, што залучаюць «прыгажосць»:

1) стараанглійская мова – сучасная англійская мова;

2) старафранцузская мова – сярэднефранцузская мова – сучасная англійская мова;

3) сярэднефранцузская мова – сучасная англійская мова;

4) сучасная французская мова – сучасная англійская мова;

5) старажытнаскандынаўская мова – англа-нармандская мова – стараанглійская мова – сучасная англійская мова;

6) лацінская мова – старафранцузская мова – сярэднефранцузская мова – сучасная англійская мова;

7) лацінская мова – стараанглійская мова – сучасная англійская мова;

8) грэчаская мова – стараанглійская мова – сучасная англійская мова.

Такім чынам, мікраполе «прыгожы знешні выгляд» утвараецца мноствам іерархічна арганізаваных значэнняў. Аналіз унутранай формы яго ў англійскай мове паказаў, што многія лексемы падчас моўнай эвалюцыі ўвабралі ў сябе шмат дадатковых семантычных адценняў, некаторыя з якіх захаваліся і на сённяшні дзень. Прыгожы знешні выгляд, паводле этымалогіі многіх слоў, уяўляе сабою сіметрыю, дасканаласць вонкавай формы чалавека ці аб’екта, а таксама ён з’яўляецца вынікам намаганняў, скіраваных на падтрымку знешняга выгляду і матэрыяльнага дастатку. Лексемы, якія ўваходзяць у лексіка-семантычнае мікраполе «прыгожы знешні выгляд», паходзяць з многіх старажытных і сучасных моў. Некаторыя з іх развілі ці сказілі першапачатковае значэнне, закладзенае ў іх у рамках «донарскай» мовы. Мікраполе «прыгожы знешні выгляд» перасякаецца з іншымі палямі: «якасць», «асоба/аб’ект», «святло», «дзіва», «ачышчэнне» і «розум».

Літаратура

1. Караулов, Ю.Н. Общая и русская идеография / Ю.Н. Караулов. – М. : Наука, 1976. – 355 с.

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

2. Попова, З.Д. Лексическая система языка / З.Д. Попова, И.А. Стернин. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : URSS, Книжный дом «Либроком», 2009. – 171 с.

3. Hornby, A.S. Oxford Advanced Learner's Dictionary of Current English / A.S. Hornby, M. Ashby. – Oxford : Oxford University Press, 2005. – 1905 p.

4. Morris, W. The American Heritage Dictionary of the English Languages / W. Morris. – Boston : HMH, 2007. – 2112 p.

5. Cambridge Advanced Learner's Dictionary / Elizabeth Walter. – 3rd edition. – Cambridge : Cambridge University Press, 2008. – 1800 p.

6. Donald, J. Chambers' Twentieth Century Dictionary / ed.: C. Schwarz. – London : Chambers Harrap, 2011. – 1936 p.

7. Merriam-Webster Online: Dictionary and Thesaurus [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.merriam-webster.com. – Date of access : 10.09.2018.

8. Webster's New World College Dictionary / ed.: M.E. Agnes, D.B. Guralnik. – Springfield : G. & C. Merriam Co., 2007. – 1744 p.

9. Partridge, E. Origins A Short Etymological Dictionary of Modern English / E. Partridge. – London : Routledge, 2006. – 4218 p.

10. Маковский, М.М. Историко-этимологический словарь английского языка / М.М. Маковский. – М. : Издательский дом «Диалог», 1999. – 416 с.

Гродненский государственный
университет им. Я. Купалы

Поступила в редакцию 20.01.2019

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ